№ 28 (525)
Ліпень 2014 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

## У нумары:

☞ 1914-ы: *салдацкі кубак* – *стар. 4*

☞ Наша гісторыя: *савецкі сцяг над Слонімам* – *стар. 5*

☞ Спадчына: *архіў Алеся Бачылы* – *стар. 7*




Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

# Полацк як калыска беларускай дзяржаўнасці

***Нядаўна група энтузіястаў завяршыла эскізны праект рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Полацка. Тэрыторыю Верхняга замка плануецца пераўтварыць у паркава-архітэктурны і музейны комплекс, насычаны фрагментарна аднаўленай гістарычнай забудовай. Прычым аўтары даволі смела «спалучылі эпохі» – на іх рэндарах драўляныя вежы часоў зараджэння Полацка суседнічаюць з фартыфікацыйнымі ўмацаваннямі XVI ст., а тыя, у сваю чаргу – з будынкамі ўжо XIX... Планы ёсць і на іншыя раёны старадаўняга горада.***

***У круглым стале, зладжаным рэдакцыямі газеты «Культура» і «Краязнаўчай газеты» ўзялі ўдзел старшыня Беларускага фонду культуры, старшыня Беларускага камітэта Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС), галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Уладзімір Гілеп, галоўны дырэктар міжнароднага радыё «Беларусь», ганаровы грамадзянін Полацка Навум Гальпяровіч, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама Віктар Палушкін, дырэктар Полацкага нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Тамара Джумантаева, гісторык і археолаг Сяргей Тарасаў, архітэктар, дацэнт БДЭУ Уладзімір Цялежнікаў, журналістка «Краязнаўчай газеты» Наталія Купрэвіч, а таксама рэдактар аддзела газеты «Культура» Ілья Свірын.***

**Н. Гальпяровіч:** – Не буду вызначаць месца нашай першай сталіцы ў рэйтынгу беларускіх адметнасцяў – кожны пагодзіцца з тым, што Полацк у самым версе іх пераліку. І мы, палачане (хай сабе і з мінскай прапіскай), робім усе магчымыя захады для развіцця свайго любімага горада. Так, гэта кроплі, але менавіта з іх і складаюцца рэкі ды моры. Прыкладам, не так даўно быў ініцыяваны збор сродкаў на аднаўленне фрэсак у Спаса-Ефрасіннеўскім саборы. І справа нават не толькі ў сабраных грошах – перадусім мы ставілі сабе за мэту прыцягнуць грамадскую ўвагу. Сёння перад намі стаіць падобная задача – наданне галоснасці тым задумам па рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Полацка, якія з'явіліся ў апантаных патрыётаў свайго роднага горада і сваёй краіны. Даведаўшыся ад Уладзіміра Цялежнікава пра гэты праект, мы з шаноўным Уладзімірам Гілепам выступілі з прапановай аб правядзенні гэтага круглага стала.

**У. Цялежнікаў:** – Пра ролю Полацка ў беларускай гісторыі нагадваць будзе нават залішнім, і я перакананы, што першая нашая сталіца павінна выконваць вельмі важную ідэалагічную функцыю, спрыяючы адзінству нацыі. Але... што мы маем у выніку? Турыста, які прыязджае ў горад, можна заняць усяго на пару гадзін. Ёсць асобныя аб'екты, не спалучаныя ў адзіную зону. А падыход павінен быць прынцыпова іншым: Полацк належыць разглядаць як адзінае цэлае. І менавіта такую спробу мы пачалі рабіць тры гады таму разам з навукоўцам Сяргеем Тарасавым і мастаком Сяргеем Цімохавым (вечная яму памяць).

**С. Тарасаў:** – Вядома, у Полацку зроблена ўжо вельмі багата – той жа першы на Беларусі музей-запаведнік... Тут ёсць на што паглядзець. Аднак турысту важна не толькі наведаць паасобныя цікавосткі, але і адчуць атмасферу горада. Прыязджаеш у Рыгу ці ў Талін – і адразу занураешся ва ўнікальнае культурнае асяроддзе, прапітанае даўнінай. І наша задача – аднавіць яго і ў Полацку. Задача, трэба адзначыць, не з простых: лягчэй адрэстаўраваць паасобны помнік спадчыны (хай сабе і такі маштабны, як ансамблі ў Міры і Нясвіжы), чым пераманіць горадабудаўнічую сітуацыю.

Але ўсё адно гэтым неабходна займацца. Бо сёння, па сутнасці, Полацк трымаецца на сваёй міфалагеме. Людзі з усяго свету прыязджаюць далучыцца да мінуўшчыны...

**У. Цялежнікаў:** – І атрымліваюць расчараванне. Лепшая частка таго, што мы сёння маем, была зробленая яшчэ гадоў 30 таму, пры легендарным дырэктары Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка Таццяне Рудавай: гэта і рэстаўрацыя «Сафіі», і ўдала вырашаны помнік Скарыне, і тыя музеі, што сёння з'яўляюцца гонарам Полацка – уключна з карціннай галерэяй. Важна, што ўжо тады горад разглядаўся як адзіны комплекс.

У цэнтральнай частцы Полацка сёетое рабілася і пазней – асабліва ў той час, калі мэрам горада быў Уладзімір Тачыла. Але ж тады асаблівая ўвага надавалася адлюстраванню перыяду Расійскай Імперыі. Не маю нічога супраць, але адзначу, што Полацк найперш цікавы сваёй мінуўшчынай IX – XVI стст. А для таго, каб больш выразна яе «праявіць», за апошні час не зроблена, бадай, нічога. Выключэнні – зусім няўдалы, на маю думку, помнік Ефрасінні Полацкай і цудоўны помнік Усяславу Чарадзею, які быў сапсаваны дрэннай пастаноўкай.

У кожным разе, усё гэта – асобныя лакальныя рашэнні, якім бракуе сістэмнага падыходу. Вось свежы прыклад. Пра тое, што з тэрыторыі Верхняга замка трэба прыбраць бальнічны комплекс, казалі ўжо даўно. Прыбралі. І цяпер не ведаюць, што з гэтым усім рабіць. Бюджэтныя грошы ідуць на ўтрыманне «чырвонай бальніцы» – проста каб не развалілася. Адсюль і выснова: калі няма канкрэтыкі адносна функцыянальнага прызначэння, вельмі складана ўбачыць мэту і перспектыву развіцця.

**У. Гілеп:** – Дык а што трэба, каб тое адзінае бачанне з'явілася?

**У. Цялежнікаў:** – На мой погляд, для пачатку трэба вызначыцца з генпланам гістарычнай часткі Полацка – з абавязковай канкрэтызацыяй прызначэння кожнага аб'екта. І няўхільна яго прытрымлівацца.

**Т. Джумантаева:** – Але ж генплан Полацка ўжо зацверджаны, перарабляць яго будзе і дорага, і складана.

**У. Гілеп:** – Наўрад ці гэта прынцыпова невырашальная праблема. І калі трэба ўносіць у генплан карэктывы – а па ўсім відаць, што без іх не абыдзецца, – значыць, тыя грошы належыць выдаткаваць. Ды і не думаю, што гутарка вядзецца пра нейкія касмічныя сумы.

***Працяг тэмы на стар.3***

## На тым тыдні...

✓ **22 ліпеня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва запрацавала **выстаўка жывапісу «Сады» Міхаіла Шыкава**.

Бліжэй пазнаёміцца з творчасцю таленавітага мастака можна да 23 жніўня.

✓ **24 ліпеня** ў мінскай выставачнай зале крэатыўнай прасторы «ЦЭХ» пачала працаваць выстаўка «Візуальныя вобразы **гістарычнай памяці, альбо Вялікае Княства Літоўскае на старажытных геаграфічных мапах»**. Старажытныя мапы ўяўляюць сабой унікальныя артэфакты і валодаюць магічнай сілай. Гэта своеасаблівыя парталы ў часе, візуальная машына часу, якая дазваляе нам вандраваць па розных стагоддзях і прасторах, гісторыях, мовах і культурах – і праз гэта шукаць, разумець, суадносіць і канструяваць сябе ў новых кантэкстах і межах.

У рамках выставачнага праекта таксама адбудуцца: 1 жніўня – дыскусія «Дзе ў Сусвеце плыве Беларусь?..» з удзелам вядомых філосафаў, культуролагаў, дызайнераў; 13 жніўня – дыскусія «Беларуская картаграфія як дысцыпліна і падмурак самавызначэння» з удзелам беларускіх гісторыкаў і сацыёлагаў.

Выстаўку можна наведаць да 31 жніўня.

✓ **24 ліпеня** ў кнігарні «Галіяфы» прайшла **прэзентацыя новай кнігі эсэ «Ніякай літасці Альгерду Б.»** Альгерда Бахарэвіча, куды ўвайшлі тэксты, што з'яўляліся на сайце budzma.by цягам года.

Мерапрыемства ладзілася сумесна з грамадска-культурніцкай кампаніяй «Будзьма беларусамі!»

✓ **26 ліпеня** на хутары Вайцюшкі адбыўся **«Ліпеньскі сямейнік у Вайцюшках»**. Гэты хутар – сядзіба Зьмітра Вайцюшкевіча, што хаваецца ў лесе пры самым беразе Нёмана і знаходзіцца непадалёк горада Бярозаўка, за 170 кіламетраў ад Мінска. У гэты дзень на вясёлым сямейніку былі арганізаваныя творчыя майстэрні (валянне, дэкупаж, малюнак), праводзіліся спартыўныя гульні (валейбол, футбол, эстафеты), арткірмаш, працавала дзіцячая кавярня. Завяршэннем дня стаў канцэрт З. Вайцюшкевіча і WZ-Orkiestra.

✓ **27 ліпеня** ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» (адкрыты 27 ліпеня 1994 года) адбылося **свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета»**. У літаратурна-музычнай імпрэзе ўзялі ўдзел вядомыя беларускія пісьменнікі і дзеячы культуры Анатоль Бутэвіч, Віктар Шніп, Людміла Рублеўская, Серж Мінскевіч, Зміцер Арцюх, Эдуард Агуновіч, Мікола Трус і інш.




# Новы набор у школу

***Сёлета ў верасні пры мінскім прыходзе ў памяць свяціцеля Мікалая, епіскапа і асветніка Японіі, працягне сваю дзейнасць Школа практычнай генеалогіі (ШПГ), створаная з мэтаю асветы прыхаджанаў храма і ўсіх ахвочых у пытаннях духоўнага самапазнання, практычнага пошуку інфармацыі пра сваіх продкаў, выхавання дзяцей на прыкладах з гісторыі роду.***

Заняткі будуць уключаць не толькі навуковую тэорыю, але і асабісты вопыт у складанні і асэнсаванні ўласнага радаводу, папулярызацыю гістарычнай дакументальнай спадчыны і набыткаў айчыннай гістарыяграфіі, знаёмства з вядомымі спецыялістамі ў гэтай сферы.

Вучэбная ініцыятыва прадугледжаная для дарослых з 18 гадоў. Запіс у школу будзе ажыццяўляцца на працягу жніўня. Для тых, хто спозніцца, канчатковы тэрмін – да 26 кастрычніка. Заняткі будуць праходзіць два разы на месяц (з 14 верасня 2014 г. па 3 мая 2015 г.) з 12.00 да 14.00 (пасля нядзельнай літургіі). Працоўныя мовы – беларуская ці руская (па жаданні слухачоў). Кіраўнік і выкладчык школы – супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (г. Мінск), намеснік старшыні генеалагічнага аб'яднання «Радавод» гістарычнага факультэта БДУ Вадзім Урублеўскі.

Усім ахвочым праслухаць курс неабходна ў заяве на імя протаіерэя Паўла, настаяцеля прыхода ў памяць свяціцеля Мікалая Японскага, пазначыць наступныя звесткі пра сябе:

1) прозвішча, імя, імя па бацьку;

2) дату і месца нараджэння;

3) род заняткаў;

4) месца жыхарства, кантактныя тэлефоны, адрас электроннай пошты;

5) генеалагічныя звесткі пра бацькоў, бабуляў і дзядуляў (прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, даты жыцця, месцы нараджэння і жыхарства, веравызнанне, саслоўнае паходжанне, сямейна-родные сувязі). Такая інфармацыя трэба, каб аказаць максімальна кампетэнтную дапамогу ў правядзенні самастойных гістарычных і генеалагічных даследаванняў.

Заявы ў рукапісным або электронным варыянце можна прадаставіць асабіста ў храме альбо даслаць на электронную пошту

slepovron@mail.ru.

**Прыкладныя тэмы і даты правядзення заняткаў на першае паўгоддзе:**

* *Духоўныя і душэўныя карані генеалагічнага пошуку. Гістарычная і генеалагічная памяць. Выхаванне дзяцей на прыкладах з сямейнай гісторыі* **(14 верасня)**.

* *Першыя крокі генеалагічнага пошуку: вусная інфармацыя, сямейны архіў, надпісы надмагільных помнікаў, інтэрнэт-рэсурсы* **(28 верасня)**.

* *Паходжанне і фарміраванне прозвішчаў жыхароў Беларусі, тэрміны сямейна-родных сувязяў, некаторыя аспекты з гісторыі традыцыйнай сям'і ў Беларусі* **(12 кастрычніка)**.

* *Асаблівасці функцыянавання дзяржаўных архіваў: кантакты, сайты, спецыфіка працы, бланкі заяваў на пошук, аплата паслугаў* **(26 кастрычніка)**.

* *Асаблівасці самастойнай працы ў дзяржаўных архівах: бланкі заяваў на працу, аплата, план і спецыфіка працы* **(9 лістапада)**.

* *Генеалагічная праца з форумамі гісторыка-генеалагічных і гісторыка-геральдычных сайтаў, сацыяльнымі сеткамі інтэрнэту* **(23 лістапада)**.

* *Правілы і прыёмы ў афармленні генеалагічнай інфармацыі; асаблівасці складання генеалагічных схемаў і роспісаў, працы генеалагічных праграмаў* **(7 снежня)**.

* *Бібліяграфія генеалогіі Беларусі: рэклама найбольш цікавых кніжных выданняў* **(21 снежня)**.

Ахвяраванні ажыццяўляюцца на добраахвотнай аснове пасля кожнага з заняткаў і прымаюцца ў мэтах далейшага развіцця ШПГ.

Месца размяшчэння храма – г. Мінск, вул. Лідская, 12; тры прыпынкі ў бок Ждановіцкага рынка ад станцыі метро «Каменная Горка» (прыпынак «Дамброўка», аўтобусы № 125, 140).

*Вадзім* **УРУБЛЕЎСКІ**

## Наш каляндар

# Дваццаць гадоў у фальварку...

***«Фальварак Ракуцёўшчына», адзін з філіялаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (цяпер адзін з філіялаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры), знаходзіцца ў вёсцы Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна. Музей быў адкрыты для наведнікаў у 1994 г.***

Музеефікацыя ракуцёўшчынскіх мясцінаў пачалася ў 1970-я. У чэрвені 1977 г. па прапанове супрацоўнікаў Мінскага абласнога краязнаўчага музея (г. Маладзечна) былі ўстаноўлены помнік у вёсцы Ракуцёўшчына – два камяні: адзін як вечная свечка памяці, на другім выбітыя радкі з «Санета» М. Багдановіча. У 1981 г. каля помніка вядомыя беларускія пісьменнікі пасадзілі Максімаў сад. З 1991 г. пачалося аднаўленне сядзібы Лычкоўскіх, дзе летам 1911-га гасцяваў паэт. Тут ён напісаў цыклы вершаў «Старая Беларусь» і «Места», паэмы «Вераніка» і «У вёсцы».

Агульная плошча экспазіцыі 210,1 квадратных метраў. «Фальварак Ракуцёўшчына» ўключае Дом арандатара, Дом гаспадара, гумно, Максімаву крыніцу, помнік і Максімаў сад.

У першую чаргу былі адноўлены Дом арандатара. Цэнтральнае месца тут займае фотаздымак дзевятнаццацігадовага Максіма, побач, яго адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок» (1913), фотаздымкі сяброў Антона і Івана Луцкевічаў, Вацлава Ластоўскага, паштоўкі з выявамі Вільні. Гэтыя экспанаты распавядаюць пра адзін з самых творча насычаных перыядаў жыцця паэта. У інтэр'еры пакоя выкарыстаны прадметы мэблі, побыту пачатку XX ст.: драўляны ложак, стол. На ім размешчаныя кнігі французскіх аўтараў, якімі захапляўся М. Багдановіч (П. Верлен, Г. Флабэр, Ш. Бадлер). Над сталом лунае птушка з саломкі як сімвал паэтычнага натхнення.

Другая частка экспазіцыі адкрылася ў 2007 г. У Доме гаспадара ўзноўлены інтэр'еры гасцёўні, кухні, створаны дзіцячы пакой. Самая вялікая частка экспазіцыі размясцілася ў гасцёўні. Менавіта тут маладога паэта сустракалі гаспадары з беларускай гасціннасцю і шчырасцю, былі яго суразмоўцамі і дарадцамі. Адметнасцю экспазіцыі ў Доме гаспадара стаў дзіцячы пакой з лялечнай мэбляй, буфетам і канапкай, дзіцячымі рэчамі. Інтэр'ер кухні адноўлены часткова, экспануюцца тыповая мэбля і прадметы хатняга ўжытку.

У гумне размешчаная экспазіцыя, дзе прадстаўленыя прылады працы селяніна: сярпы, цапы, прыстасаванні для апрацоўкі лёну і інш. У цэнтры – тагачасныя транспартныя сродкі: сані і воз (узор сталярнай і кавальскай працы). Цікавымі пададуцца наведніку вялізныя карабы для захоўвання зерня, пляцёнкі з лазы і саломы, дзежкі.

Штогод у музеі праводзіцца свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета», прысвечанае памяці паэта – гонару нацыі.

*Падрыхтаваў*
*Алесь* **САЧАНКА**



# Полацк як калыска беларускай дзяржаўнасці

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

**В. Палушкін:** – Для нас вельмі важна, што мы сёння абмяркоўваем тут гэтую тэму – магчыма, з вялікім спазненнем. Я згодны з тым, што генплан належыць пераглядзець, і галоўная мэта на сёння – менавіта аб'яднаць лакальныя праекты ў адну цэласную сістэму. Калі мы гэтага не дасягнем цяпер, далей зрабіць тое будзе нашмат складаней. Каб мы не наламалі дроў, павінна быць цэласнае бачанне канцэпцыі развіцця Полацка.

**У. Цялежнікаў:** – Мяне больш за ўсё непакоіць пасіўная пазіцыя горада: цалкам «за», але толькі на словах. Як быццам павінен нехта прыйсці, усё зрабіць, а мы будзем толькі згодна ківаць галавой. Безумоўна, мы, палачане з розных куткоў свету, дапаможам чым можам. Але ж сама ініцыятыва мусіць сыходзіць менавіта ад гарадскіх уладаў.

**І. Свірын:** – Мушу засведчыць, што кіраўніцтва райвыканкама паставілася да нашай сённяшняй сустрэчы з вялікай увагай. І перад тым, як папракаць яго ў браку ініцыятывы, трэба ўзяць пад увагу відавочнае: у Полацку ёсць процьма надзённых і злабадзённых праблемаў, якія чакаюць свайго вырашэння. Скажам, той жа стан устаноў культуры... Вунь кінатэатр ужо колькі гадоў рамантуюць!

**В. Палушкін:** – Песімізм тут недарэчны: мы рухаемся наперад, хай сабе і маленькімі крокамі. Завяршаем школу мастацтваў, хочам давесці да ладу гарадскі дом культуры, затым і за кінатэатр возьмемся ўсур'ёз. Для завяршэння патрэбна 14 – 15 мільярдаў рублёў. Такіх грошай пакуль няма, але мы ўжо набылі 3D-абсталяванне, каб частку гэтых сродкаў установа магла зарабіць сама.

**У. Гілеп:** – Ніхто і не разлічвае на тое, што маштабныя праекты рэгенерацыі будуць рабіцца толькі сіламі мясцовых уладаў. Але гэта ніяк не мяняе галоўнага: ініцыятыва ўсё адно павінна сыходзіць ад Полацка. І менавіта мясцовыя ўлады мусяць грукаць у тыя дзверы, за якімі ім могуць дапамагчы.

**У. Цялежнікаў:** – Я б хацеў звярнуць увагу яшчэ і на такі момант: Полацкі музей-запаведнік мае сціплы абласны статус. Хіба адпавядае ён значэнню Полацка ў беларускай гісторыі – і той ролі, якую ён павінен адыгрываць у фарміраванні нацыянальнай ідэалогіі?

**Т. Джумантаева:** – Статус у нас рэспубліканскі, але падпарадкаванне – і сапраўды абласное.

**У. Цялежнікаў:** – Як паказвае практыка, прамежкавае звяно – вобласць – пачынае спаборнічаць з Полацкам, і ў Віцебску грошай засвойваецца значна больш. Хаця дзяржаўнае мысленне павінна дыктаваць акурат адваротныя прыярытэты. Недарэмна яшчэ пры савецкай уладзе такія аб'екты, як Полацк, мелі самы высокі статус.

**І. Свірын:** – Дарэчы, а ці разглядаўся пры стварэнні плана рэгенерацыі эканамічны аспект? Колькі гэта будзе каштаваць, якія перспектывы...

**У. Цялежнікаў:** – А як жа іначай! Па сваёй былой пасадзе – генеральнага дырэктара Белдзяржаб'яднання арганізацый бытавога абслугоўвання насельніцтва – я ведаю падыход да ўсіх падобных ініцыятываў кіраўніцтва краіны. Адразу гучаць два пытанні: колькі каштуе і што гэта дасць? І пытанні гэтыя, вядома ж, вельмі правільныя. Мы павінны разглядаць архітэктурны комплекс яшчэ і як бізнес-праект, а не проста прасіць грошы, напіраючы на сваю даўнюю гісторыю.

Выкладкі ў нас наступныя: для ўвасаблення Верхняга замка як адзінага архітэктурнага комплексу па нашых прыблізных разліках патрэбна каля 5 мільёнаў долараў. Гэта няшмат. Для прыкладу, кожныя 30 тысяч беларускіх турыстаў, якія наведваюць Полацк штогод, прыносяць у кансалідаваны бюджэт краіны мільён долараў – маюцца на ўвазе выдаткі на транспарт, харчаванне і г.д. Адпаведна, затрачаныя грошы могуць вярнуцца вельмі хутка.

**Т. Джумантаева:** – Тым болей, калі ўлічыць, што паводле нашай статыстыкі Полацк штогод наведвае не 30 тысячаў турыстаў, а 230! Болей за 230 тысячаў чалавек. Толькі ў маі ў нас было 35 тысячаў наведнікаў – болей, чым ва ўсіх турцэнтрах краіны, апрача Брэсцкай крэпасці. Але, калі шчыра, такая моцная плынь не спараджае належнага эканамічнага эфекту. Большасць прыязджае ў Полацк ледзь не транзітам, літаральна на адзін дзень. Прычына вядомая: брак інфраструктуры.

**У. Цялежнікаў:** – Мы запланавалі ў рамках гэтага комплексу і кавярні, і невялічкія гатэлі. Таму я больш чым перакананы, што гэты праект будзе рэнтабельны, і менавіта з яго належыць пачынаць рэгенерацыю гістарычнага Полацка.

**І. Свірын:** – Наколькі рэальныя, на вашую думку, перспектывы прыцягнення пазабюджэтнага фінансавання?

**У. Цялежнікаў:** – Цалкам рэальныя. Калі мы вызначымся з мэтавым прызначэннем аб'ектаў, будзе адразу зразумела, дзе і якім чынам нам належыць шукаць грошы. Можна будзе падзяліць праект на часткі і прапаноўваць іх інвестарам пад канкрэтныя праекты. Хочаш мець кавярню ў турыстычным цэнтры – укладай у яе свае сродкі ды ствары у вызначаным на плане месцы. Зразумела ж, што кавярні і гатэлі – справа прыватніка, а не дзяржавы. Адна ўмова – вытрымаць гістарычны знешні выгляд.

Альбо іншы прыклад: мы прапанавалі стварыць мемарыяльны знак, які б адлюстроўваў першасны вобраз Сафійскага сабора – не XVIII ст., як сёння, а XII. Цана пытання – усяго нейкіх 10 тысячаў долараў. Перакананы, што знойдзецца мецэнат, які ахвяруе такую суму – хаця б толькі дзеля таго, каб увекавечыць у бронзе сваё імя.

**Т. Джумантаева:** – Мы, дарэчы, не так даўно зрабілі архітэктурнае вырашэнне крынічкі каля Сафійскага сабора. Адпаведна, нешта ўсё ж робіцца. У нас ёсць паслядоўнасць у вырашэнні даўно пастаўленых мэтаў.

**Н. Гальпяровіч:** – Я не спецыяліст у галіне турыстычнай інфраструктуры і таму хацеў бы закрануць іншы аспект – пашырэнне ведаў пра Полацк сярод самых шырокіх слаёў грамадскасці. Пэўныя зрухі тут, вядома ж, ужо адбываюцца – прыгадайма, хаця б, нядаўнюю кніжку для школьнікаў, выдадзеную ў «Пачатковай школе». А якім мог бы стаць наступны крок? Лічу, Полацк заслугоўвае вялікага культурнага свята. Адну такую ідэю мы ўжо прапрацоўваем. Прычым сама гісторыя Полацка падказвае міжнародны фармат гэтага свята. Глядзіце, колькі тут повязяў з усім светам: з Расіяй, Латвіяй, Літвой, Польшчай, Чэхіяй...

**І. Свірын:** – Безумоўна, планаў вельмі шмат, і наўрад ці яны хутка ўвасобяцца ў жыццё. Што тычыцца рэгенерацыі забудовы... Тут, па-мойму, ёсць адна вельмі сур'ёзная небяспека: пакуль навукоўцы будуць спрачацца пра канцэпцыю падыходу (а не выпадае сумнявацца ў тым, што спрачацца яны будуць вельмі доўга), можа прыйсці куды больш упэўнены ў сваіх намерах інвестар ды адхапіць ласы кавалак у цэнтры горада пад супермаркет альбо казіно.

**У. Цялежнікаў:** – Таму і трэба адразу вызначыцца з функцыянальным прызначэннем. І спыніць практыку будовы дамоў заможных людзей на ўчастках, якія маюць гістарычную каштоўнасць.

**І. Свірын:** – Ці ёсць такія факты?

**У. Цялежнікаў:** – Мора. Апошняе ўдакладненне генплана было звязанае акурат з тым, што гістарычныя землі ў цэнтры горада распрадаваліся пад індывідуальнае будаўніцтва. Альбо такі выпадак: практычна побач з некропалем хацелі паставіць гатэль. І навуковы кіраўнік гістарычнага цэнтра Полацка Вадзім Глiннік заняў у гэтым выпадку даволі пасіўную пазіцыю.

**В. Палушкін:** – Полацк – горад старажытны, але ён працягвае развівацца, і працэс гэты ніяк не спыніць. Таму нашая першачарговая задача – вызначыць тыя зоны, якія забудоўваць трэба вельмі асцярожна. І самы першы крок – даследаванне і вывучэнне. Толькі на такім падмурку можна рабіць канкрэтныя аргументаваныя прапановы.

**С. Тарасаў:** – Для мяне як для археолага выраз «гістарычная глеба» мае цалкам рэальны змест, і калі я хаджу па Полацку, дык ведаю, што ў мяне пад нагамі. Таму хацеў бы адзначыць: ужо сёння неабходна распачынаць грунтоўныя даследаванні на тэрыторыі таго ж Верхняга замка.

**У. Цялежнікаў:** – Тым болей, склалася вельмі спрыяльная сітуацыя: тэрыторыя Верхняга замка фактычна вызваленая і для раскопак, і для далейшага стварэння турыстычнай зоны. Там засталіся яшчэ некалькі лецішчаў, але ім наканаваны знос, не сёння дык заўтра.

**Т. Джумантаева:** – Праект рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Полацка сапраўды маштабны, і таму сёння вельмі важна расставіць прыярытэты. Зрэшты, яны вымалёўваюцца самі сабою: пачынаць, без сумневу, трэба з Верхняга замка.

**І. Свірын:** – А ці ёсць у такім выпадку гарантыя, што ўсім разнапрофільным уласнікам удасца паміж сабою дамовіцца і ніхто з іх не будзе цягнуць коўдру на сябе? Якім будзе механізм вырашэння тых ці іншых канфліктных пытанняў?

**Н. Купрэвіч:** – Зразумела ж, што ў інвестараў свой інтарэс: атрыманне прыбытку. Але за мяжою ёсць нямала прыкладаў таго, як разнастайныя аб'екты розных формаў уласнасці і ўзроўняў падпарадкавання паспяхова суіснуюць на адной тэрыторыі. Што для гэтага трэба рабіць? Стварыць дэтальны і добра прадуманы план кіравання, які меў бы юрыдычную сілу. Кантроль за яго выкананнем павінен быць на самым высокім узроўні – рэспубліканскім. І ў гэтым плане можна падрабязна распісаць, што і каму належыць рабіць, і чаго не належыць, і які працэнт ад атрыманага прыбытку скіроўваць на рэстаўрацыю і г.д.

**У. Цялежнікаў:** – У свой час горад і краіна ўклалі нямала сродкаў у аднаўленне Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, і калі браць агулам, сёння ён у добрым стане – хаця нехта там трошкі сайдынг выкарыстоўвае... Але атрымалася такая рэч: тыя сродкі, якія пакідаюць турысты, застаюцца ў Полацкай епархіі. Хаця ўкладала ў рэстаўрацыю дзяржава.

**Т. Джумантаева:** – У той жа час мы сёння маем іншую праблему: скончанае раскрыццё старадаўніх фрэсак, але для працягу рэстаўрацыйных работ фінансавання няма другі год. Паводле цяперашняга заканадаўства, дзяржава не можа выдаткоўваць сродкі на тыя аб'екты, якія не знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. Таму, каб аплаціць працу ўнікальных даследчыкаў з «Эрмітажа», мы неяк дамаўляемся з матушкай... І што атрымліваецца: аб'ект прэтэндуе на ўключэнне ў Спіс сусветнай спадчыны, работы, якія там праводзяцца, унікальныя нават па еўрапейскіх мерках, а механізмы вырашэння пытанняў нейкія зусім местачковыя.

**У. Гілеп:** – Натуральна, агучаныя сёння складаныя пытанні нельга вырашыць умомант, але важна і далей працягваць канкрэтныя захады. У звязку з гэтым маю прапанову: давайце мы ад нашага круглага стала звернемся да Навукова-метадычнай рады па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцяў з прапановай зрабіць выязное пасяджэнне ў Полацку – заслухаць тыя ідэі, якія прагучалі сёння, азнаёміцца з праектам Верхняга замка.

**В. Палушкін:** – Будзем вельмі рады прыняць такую паважную дэлегацыю.

**Н. Гальпяровіч** *(з жартам)*: – Але няма сумневу ў тым, што пачынаць трэба з Верхняга замка, з «чырвонай бальніцы», дзе я нарадзіўся.

**У. Цялежнікаў:** – Мы ўсе пачыналі з таго, што хлапчукамі кожную паводку шукалі ў рацэ старадаўнія манеты. У мяне іх было ажно 80 штук, нават сапраўды дынарый Вітаўта! Так робяць і хлапчукі сённяшнія.

**І. Свірын:** – І няўжо нешта знаходзяць?

**У. Цялежнікаў:** – Вядома! Тыя скарбы, што тоіць у сабе Полаччына, папраўдзе невычарпальныя.

**Ад «КГ».** ***Вось так, на вясёлай нотцы, але аптымістычна па сутнасці, і завяршыў працу круглы стол, арганізаваны газетай «Культура» і «Краязнаўчай газетай» – як сімвал яднання дзяржаўнай і грамадскай думкі па важных нацыянальных пытаннях. Ці зможам мы перадолець цяжкасці, якія мае сёння старажытны Полацк? Бо гэты горад – першародная крыніца беларускай дзяржаўнасці, і інтарэс сучаснай Беларусі тут – надзвычайны!***




# Апавяданне Максіма Гарэцкага «Рускі» ў еўрапейскім літаратурным кантэксце

*(Працяг. Пачатак у №№ 26, 27)*

Канцэптуальна важна ў абраным намі кампаратыўным ракурсе, што і ў Ф. Кафкі, і ў М. Гарэцкага героі ўяўляюць сабою персаніфікацыю комплексу віны. У аўстрыйскага пісьменніка праблема віны мела перадусім вытокі асабістыя; як вядома, ён праз усё сваё нядоўгае жыццё пачуваўся вінаватым перад сям'ёй, асабліва перад дэспатам-бацькам, сам быў жывым увасабленнем амбівалентнасці, раздвоенасці, існаваў – паводле яго ўласнага прызнання – у стане «не смерці, а вечнай пакуты памірання». Неадольнае пачуццё віны будзе перажываць і яго герой Рыгор Замза.

У той жа час, на што вышэй ужо была звернутая ўвага, навела Ф. Кафкі не была адно мастацкай сублімацыяй яго інтымных перажыванняў, іначай не ўспрымалася б яна цягам усяго XX стагоддзя як метафара рэчаіснасці, як універсальная выява існавання чалавека ў небяспечным, жорсткім свеце. Бясспрэчна, мае рацыю вядомы расійскі германіст У. Сядзельнік, калі піша: *«логіка прамінулага «кафкаўскага» або «кафкіянскага» стагоддзя не вытрымала выпрабавання на слушнасць. Але галоўнае – у гэтых часткова запазычаных у жывога жыцця, часткова сканструяваных вобразах і малюнках таілася не падлеглая раскрыццю загадка быцця і небыцця...»*.

Сам аўтар «Ператварэння» заўважаў, што «Замза не з'яўляецца цалкам Кафкам», што наогул уся «сучаснасць – гэта змяненне і ператварэнне». «*Мы пачынаем разумець*, – пісаў Герман Гесэ, – *што Кафка быў адзінокім папярэднікам, што ён нашмат раней, чым мы, спазнаў пякельную пакуту вялікага духоўнага і экзістэнцыяльнага крызісу...*». Насамрэч, праблема віны ў навеле ў рэшце рэшт засланяецца іншай праблемай – трагічнай адзіноты чалавека сярод людзей і безвыходнасці гэтага становішча. Ды і сама віна героя Ф. Кафкі падаецца выразна амбівалентнай: з аднаго боку, Рыгор Замза не апраўдаў надзеяў сям'і; з іншага – чытач бачыць і віну сям'і перад Рыгорам, якога яна звыкла ўспрымала як сродак здабывання матэрыяльных дабротаў і ад якога бязлітасна адвярнулася пасля напаткаўшай яго бяды.

Гэтаксама неадназначнай уяўляецца праблема віны (наогул аднаго з тыповых пачуванняў герояў М. Гарэцкага на вайне) Рускага. З аднаго боку, ён забойца, і забойства гэтае тым больш страшнае, што ў асобе аўстрыяка ён пазбаўляе жыцця сапраўды, у пэўным сэнсе, «свайго» – славяніна, украінца, «брата». З іншага боку, яшчэ большая віна ляжыць на тых, хто навязаў яму ненатуральныя, ненармальныя правілы паводзінаў, згвалтаваў яго душу, маральна яго і мільёны такіх, як ён, дэзарыентаваў, намогшыся чалавека ад зямлі **ператварыць** у «чалавека мілітарызаванага» (гэткае вызначэнне новага, народжанага вайною антрапалагічнага тыпу прапанаваў у свой час расійскі філосаф М. Бярдзяеў), асудзіўшы на немач, на бязмежную пякельную нуду, кажучы словамі Антона Адамовіча (прамоўленымі, праўда, на адрас персанажа іншага апавядання М. Гарэцкага – «Рунь») – на «нашэнне ў сабе глыбокай псыхолёгічнай трагэдыі».

Як вядома, М. Гарэцкі, неаднойчы будзе трактаваць вайну як самагубства, пісаць пра яе атрутны ўплыў на чалавека. Асабліва недвухсэнсава гэты матыў прагучыць у шматлікіх эпізодах кнігі «На імперыялістычнай вайне», у адчайнагоркіх роздумах Лявона Задумы: «*А ўсе скаты двухногія. Хай жыве вайна – знішчэнне скатоў скатамі! Мы не людзі, мы – быдла...*»; «*А я ж пасабляю, не – не пасабляю, а сам разам з другімі старанна забіваю людзей. Забіваю такіх жа нявольнікаў, як сам. Што гэта я раблю? Пакуль што я не адчуў усяе глыбіні гэтага жаху! Не адчуў, а толькі думаў, што тут – вялікі страх, і жудасную сутнасць гэтага страху я зразумею толькі некалі пасля...*». Пры гэтым неабходна падкрэсліць: у адлюстраванні вайны як прычыны духоўнага і маральнага дзікунства проза М. Гарэцкага паўстае ў рэчышчы сусветнай літаратуры ў лепшых яе пісьменніцкіх пастацях і творах. У якасці прыкладу спашлёмся на раман расійскага мастака слова Барыса Пастарнака «Доктар Жывага» (1957; упершыню апублікаваны на Захадзе), які мае нямала судакрананняў з творамі М. Гарэцкага пра Першую сусветную вайну. «*Я яшчэ заспела час, калі мелі сілу паняцці мірнага папярэдняга стагоддзя...* – кажа гераіня рамана Б. Пастарнака. – *Смерць чалавека ад рукі іншага была рэдкасцю, надзвычайнай, нечуванай з'явай. Забойствы, як думалі, сустракаліся толькі ў трагедыях, раманах з жыцця сышчыкаў і ў газетных дзённіках здарэнняў, але не ў паўсядзённай рэальнасці. I раптам гэты скачок з ціхамірнага, бязвіннага існавання ў кроў і крыкі, павальнае вар'яцтва і здзічэнне кожнадзённага і штогадзіннага, узаконенага і ўхваленага смертазабойства*».



Руская пяхота

У творах і Ф. Кафкі, і М. Гарэцкага мае месца нейкая дзіўная, незвычайная ўстойлівасць сюжэтнага развіцця, вельмі нетрадыцыйна пададзены прынцып суадноснасці ў ім дынамікі і статыкі. I Рыгор Замза, і Рускі ўнутрана ачалавечваюцца – парадаксальным чынам – пасля факту вонкавага расчалавечвання. Замза, набыўшы пачварнае аблічча, нашмат вастрэй адчувае і сорам, і гора, і спагаду да родных, і дакоры сумлення, прагне – як ніколі раней – прыналежнасці да сямейнага кола (у той час як сям'я ўнутрана, калі дазвалязьна так сказаць, ажывёльваецца). I Рускі, па факце забойства, учыненага «без дум», нібы ў стане паўсну, па ўнутраным пачуванні таксама ачалавечваецца, сумленне не дае яму спакою, раздвоеная душа ірвецца і курчыцца ў невыносных пакутах. Як тут не ўспомніць словы апавядальніка з твора М. Гарэцкага з красамоўнай назвай «Дзве душы» (1918 – 1919): «*I душа дваіцца. Дзве душы. Тая, што плакала і жалілася на другую..., цяпер цвярдзееець, але робіцца нядобраю, набірае ўсё болей нейкай калянасці і нават жорсткасці... Ёй не шкода, і яна не здрыгнецца... Ёй не шкода. А тая, другая, падумала і здрыганулася*».

Адпаведна, абодва творы адметныя выключным мастацкім псіхалагізмам, але асаблівага кшталту. I ў «Ператварэнні», і ў «Рускім» героі паказаныя ў стане свайго роду дуалізму свядомасці і падсвядомасці; кожны з іх, кажучы словамі Г. Гесэ, – «чалавек еўрапейскага крызісу». Як і ў аўстрыйскага празаіка, так і ў беларускага знаходзяць увасабленне два канфлікты – знешні і ўнутраны. Прычым першы падкрэслена лакалізаваны, ён толькі запачаткоўвае сюжэт: у Ф. Кафкі гэта канфлікт паміж чалавечай сутнасцю і жывёльнай знешнасцю героя; у М. Гарэцкага ён традыцыйны да банальнага і сам па сабе зразумелы – паміж салдатамі ваюючых адна з адной армій, такім чынам – ворагамі па вызначэнні. Другі ж канфлікт, унутраны, займае ў кожным з твораў цэнтральнае месца, доўжыцца цягам аповеду і ўяўляе сабою гісторыю перажывання персанажамі сваіх трагедыяў, гэткіх непадобных і падобных адначасна. Пры гэтым псіхалагізм у Ф. Кафкі ў большай ступені ўніверсалізаваны, чым у М. Гарэцкага, які ніколі не выпускаў з-пад увагі ні нацыянальнага, ні сацыяльнага, ні асобаснага статуса сваіх персанажаў. Вось чаму I. Навуменка меў усе падставы сказаць пра М. Гарэцкага як пра «псіхолага ў самым высокім значэнні» слова.

**Ева ЛЯВОНАВА**

*(Заканчэнне будзе)*

## Салдацкі кубак

Кожны музей мае свае цікавосткі. Не выключэнне – і рэгіянальныя. Старшы навуковы супрацоўнік Вілейскага краязнаўчага музея Вольга Коласава расказала пра незвычайны салдацкі кубачак:

– У фондах нашага музея ёсць партсігары, біклагі, на якіх нешта надрапана. У перапынку паміж баямі салдат сядзеў і цвіком ці нечым вострым наносіў надпісы. У асноўным трапляліся такія экспанаты, якія тычыліся Вялікай Айчыннай вайны.

Калі рабілі экспазіцыю па Першай сусветнай вайне, звярнулі ўвагу на гэты кубачак. Ён зроблены з гільзы з-пад снараду. Зацікавіла, што ж там такое надрапана. Калі зрабілі расшыфроўку, то ўбачылі такія надпісы: «Въ дни Революціи», «Земля и Воля», «Въ память Войны 1914–15–16–17 гг».

Выканаў гэтыя надпісы рускі салдат (аўтограф ён таксама пакінуў на кубку). Не ведаем, як склаўся яго лёс. Магчыма, ён прыняў удзел у баі за Вілейку ў верасні 1915 года пад час Віленскай аперацыі. Далей была Нарачанская аперацыя ў сакавіку 1916 года. Потым салдаты з абодвух бакоў зразумелі бессэнсоўнасць гэтай вайны: яна ўжо стала акопнай і пачаліся братанні. Хадзілі на перамовы, магчыма, разам спявалі або танцавалі пад рускі гармонік.

Адметна, што ў надпісах на гэтым кубачку салдат выказаў настроі таго часу.

**Алесь ВЫСОЦКІ, фота аўтара**




Расшыфроўка надпісаў на кубку

***Савецкая ментальнасць беларуса не хоча змірыцца з новымі веяннямі часу, часу эканамічнага крызісу і разбурэннем веры ў сацыяльную кампаненту дзяржавы. Выжыванне ў новых умовах стаіць не толькі перад дзяржаваю, але і перад простым чалавекам. Перад гісторыкамі ж стаіць праблема знайсці той элемент, што замаруджвае хаду наперад. Але гэта ўскладняецца нашай абыякавасцю да мінулага, на якое мы глядзім толькі як на «чорнае» або «белае», што патрабуе па-новаму зірнуць на старыя праблемы.***

***Адна з іх – гэта ўсталяванне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Слонім – адзіны горад Гродзенскай вобласці, дзе такіх спробаў было чатыры, першая з якіх зацягнулася на паўтары месяцы, а апошняя – на 47 гадоў. Але факт застаецца фактам, як з боку прыхільнікаў тых часоў, так і іх праціўнікаў, цяпер мы жывем у новай гістарычнай сітуацыі. А праблемы застаюцца тыя ж.***

Наша гісторыя



# Першая спроба ўсталявання Савецкай улады ў Слоніме. 1919 год

Шлях да першага ўзняцця чырвонага сцяга над Слонімам пачаўся са з'яўлення першай гарадской падпольнай камуністычнай ячэйкі ў лістападзе 1918 года, якая існавала дзякуючы энтузіязму і надзеі на светлае будучае. Яна складалася з 5 чалавек: рабочы-сталяр Юлі Ізнайдзін-Герман, які быў адным са стваральнікаў партызанскага атрада, а пасля выгнання немцаў – членам павятовай надзвычайнай камісіі, кравец-падпольшчык Ю. Карліцкі, які ў 1920 годзе загінуў на фронце ў баях супраць войскаў Дзянікіна, Я. Куніца, К. Куніца-Альберцінскі і Кунда.

Пашырэнню дзейнасці ячэйкі спрыяў той факт, што 13 лістапада 1918 года ў сувязі з Германскай рэвалюцыяй і Камп'енскім пагадненнем савецкі ўрад ануляваў Брэсцкі мір. Нямецкае камандаванне, баючыся канчатковага развалу арміі, 16 лістапада выдала загад аб эвакуацыі з тэрыторыі былой Расійскай Імперыі. Услед за імі ішла савецкая Заходняя армія, якая вымушала немцаў эвакуявацца ў больш сціслы тэрмін, каб не даць вывезці нарабаваную маёмасць.

6 снежня 1918 года ў адным з закінутых дамоў на ўскраіне Слоніма, у памяшканні былой казармы, быў праведзены сход рабочых, якія спачувалі бальшавікам. На з'ездзе былі прынятыя ў партыю 35 чалавек. Партыйны камітэт устанавіў сувязь з ячэйкамі Ружанаў, Дзятлава, а затым звязаўся з Мінскам, заняўся скліканнем з'езда Саветаў, які пачаў сваю працу 9 снежня і праходзіў у доме № 18 па вуліцы В. Крайняга. На з'ездзе прысутнічала 36 дэлегатаў: 27 чалавек былі выбраны ад сельскай мясцовасці, чатыры дэлегаты – ад горада і пяць чалавек прадстаўлялі ініцыятыўную групу па скліканні з'езда.

Адкрыццё з'езда адбывалася легальна, што Я. Куніца тлумачыў наступным чынам: *«Партыйнай арганізацыі ўдалося падмануць нямецкія ўлады – атрымаць дазвол на скліканне нарады прадстаўнікоў горада і вёскі нібыта для рашэння зямельных і іншых гаспадарчых спраў»*. У гэты дзень адбыліся толькі ўрачыстыя мерапрыемствы, а сам з'езд пачаў працу на наступны дзень – 10 снежня.

З'езд паставіў задачы, якія было немагчыма вырашыць ва ўмовах нямецкай акупацыі – аб арганізацыі ўлады на месцах, раздзеле і выкарыстанні памешчыцкіх зямель. Быў выбраны выканаўчы камітэт у складзе дзевяці чалавек, з якіх шэсць былі бальшавікамі.



Я. Куніца

У сувязі з набліжэннем войскаў Чырвонай Арміі да ўсходніх абласцей Беларусі партыйная арганізацыя і выканкам заняліся стварэннем Ваенна-Рэвалюцыйнага камітэта (ВРК), які павінен быў арганізаваць ахову павета ад адступаючай нямецкай арміі. З гэтай мэтай у Слонім на нелегальную працу былі накіраваныя ўраджэнцы горада – член Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта І. Волах, які ў 1917 годзе вярнуўся з дзесяцігадовай ссылкі, і рабочы-кравец Д. Штэйн, актыўны ўдзельнік рэвалюцый 1905 і 1917 гадоў. Старшынёй ВРК быў абраны І. Волах.

ВРК заняўся нарыхтоўкай зброі, для чаго сродкі былі дастаўленыя з Мінска, прыступіў да стварэння баявога атрада. За вельмі кароткі тэрмін тры пункты па захаванні зброі былі запоўненыя вінтоўкамі, гранатамі, тэлефоннымі апаратамі. У дзесяцідзённы тэрмін быў арганізаваны баявы атрад, у які, па словах Я. Куніцы, увайшло больш за 100 поўнасцю ўзброеных чалавек.

У сувязі з набліжэннем Чырвонай Арміі атрад быў пераведзены ў поўную баявую гатоўнасць. Нямецкія войскі, што знаходзіліся ў Слоніме, на пачатку 1919 года спешна рыхтаваліся да адступлення. У ноч з 13 на 14 студзеня яны пачалі пакідаць Слонім.

Перад баявым атрадам, які ўзначальваў ВРК, паўстала задача не дапусціць падрыву немцамі чыгуначных мастоў праз Шчару. Я. Куніца стаў сведкам яе выканання: *«Было вядома, што немцы ўзарвуць масты пасля таго, як пройдзе апошні эшалон. Атрад трымаў сувязь з таварышамі, якія знаходзіліся на чыгуначнай станцыі. Як толькі са станцыі было атрыманае паведамленне, што адтуль рушыў апошні эшалон, увесь атрад ушчыльную падышоў да чыгуначнага палатна і адкрыў ураганны агонь па паравозе з саставам, што рухаўся насустрач. Немцы не чакалі гэтага і былі заспетыя знянацку. Яны ў паніцы пачалі адстрэльвацца з кулямётаў. Цяпер ім некалі было займацца ўзрывам мастоў, бо абстаноўка патрабавала хутчэй праскочыць праз ураганны агонь, які вёў атрад. Чыгуначныя масты засталіся цэлымі»*.

Ранкам 14 студзеня ў Слонім увайшлі першыя чырвонаармейскія часці Гродзенскага палка. Над горадам узвіўся савецкі сцяг. У гонар вызвалення горада ад нямецкіх акупантаў днём адбылася вялікая дэманстрацыя.

З дапамогай войск Чырвонай Арміі ў горадзе і павеце з'явіліся органы савецкай улады: надзвычайная камісія, якую ўзначаліў Д. Штэйн, і міліцыя на чале з Ткачовым, які прыбыў з Мінска. Старшынёю ВРК стаў Куніца-Альберцінскі, а сакратаром павятовага камітэта партыі – Я. Куніца. Для пацвярджэння легітымнасці новай улады ў горадзе ў сярэдзіне лютага 1919 года быў скліканы Другі павятовы з'езд Саветаў, у якім, па звестках Я. Куніцы, прынялі ўдзел больш за 150 дэлегатаў з усяго павета.

Задачаю савецкіх органаў улады ў павеце было забеспячэнне харчаваннем войск Чырвонай Арміі, што цяжарам лягло на вёску. Але пасля сарака месяцаў нямецкай акупацыі зрабіць гэта было немагчыма. Не выратоўвалі сітуацыю і некалькі абозаў, дастаўленыя для арміі з Ружанаў і Дзятлава. Сітуацыя вяла да пашырэння эпідэміяў. Перад уладай стаяла праблема голаду, але яе вырашэнне адкладвалася. Галоўным прыярытэтам лічылася «сусветная рэвалюцыя».



Ю. Ізнайдзін-Герман

У такіх абставінах да Слоніма падыходзілі польскія войскі, значную дапамогу якім аказвалі краіны Антанты. Гісторык М. Сташкевіч зазначае, што ў першай палове 1919 года Польшча толькі ад ЗША атрымала на 60 млн даляраў зброі і на 51,6 млн даляраў харчавання. Гэта дало магчымасць давесці колькасць польскай арміі да 545 тысячаў чалавек, што і прадвырашыла яе поспехі ў 1919 годзе. Ужо да лютага 1919-га палякі толькі ў Беларусі мелі каля 80 тысячаў чалавек, што было дастаткова для захопу яе заходняй часткі, адкуль баяздольныя савецкія падраздзяленні былі перакінутыя на іншыя накірункі, дзе становішча Саветаў было найбольш цяжкім.

У раёне Слоніма пачаліся сутычкі з наступаючымі палякамі, якія 13 лютага авалодалі Зэльвай. У Слонімскім гісторыка-краязнаўчым музеі захоўваецца план гэтых баёў, складзены генерал-лейтэнантам інжынерных войск Я. Леашэняю 2 верасня 1968 года. На падставе яго можна сказаць, што завалоданне Слонімам з'яўлялася перадумовай захопу Баранавічаў, важнага чыгуначнага вузла ў Заходняй Беларусі, і дазваляла не дапусціць канцэнтрацыі савецкіх войск па лініі Ліда – Баранавічы – Лунінец. На Слонім наступала Літоўска-Беларуская дывізія генерала Вацлава Івашкевіча-Рудашанскага. З поўначы і поўдня яе падтрымліваў атрад Дамброўскага. У Слоніме супрацьстаяць ім мог толькі 4-ы Варшаўскі чырвонаармейскі полк. У такіх абставінах слонімскія бальшавікі стварылі атрад з 25 чалавек пад кіраўніцтвам Кунды.

28 лютага падраздзяленні генерала Івашкевіча атакавалі савецкія часці па рацэ Шчара і ў ноч з 1 на 2 сакавіка 1919 года акружылі Слонім. Бальшавік Я. Куніца ўспамінаў: *«Вырашылі прарвацца праз кальцо акружэння ў напрамку да Баранавічаў. Атрад рушыў да шашэйнага мосту – адзінага месца, дзе была яшчэ надзея на пераправу. Да гэтага часу ўздоўж шашы за паўвярсты ад лесу размясціўся 4-ы Варшаўскі полк. На ўзлеску стаяў атрад варожай артылерыі. Загарадзіўшы дарогу, коннікі чакалі, калі полк рушыць на прарыў, маючы мэту знішчыць яго... З правага фланга Варшаўскі полк і атрад камуністаў сталі абыходзіць пяхотныя часці. Камандаванне Варшаўскага палка, разгубіўшыся, адмовілася даць распараджэнне чырвонаармейцам ісці ўперад на прарыў. Тады ў бой пайшоў атрад камуністаў... па зусім адкрытым месцы па лёдзе Шчары рушылі кідком да ўзлеску. З крыкам "ура!", прабегшы паўвярсты, прабраўся да ўзлеску. Кавалерысты не чакалі такога контрудару, адступілі ўглыб сасновага бору. Начальнік павятовай міліцыі т. Ткачоў, будучы параненым, не выйшаў са строю, а, наадварот, сваёй стойкасцю натхняў наступаючых. Атрад камуністаў вырваўся на шашу Слонім – Баранавічы. Пайшоў уперад і 4-ы Варшаўскі полк, пакінуўшы за сабою ззаду заслону для адыходу людзей, якія выйшлі з акружэння. Камандзір атрада камуністаў т. Кунда за мужнасць і гераізм у барацьбе з белапалякамі быў затым узнагароджаны ордэнам баявога Чырвонага Сцяга»*.

***Так закончылася першая спроба ўсталявання Савецкай улады ў Слоніме. А наперадзе былі галодныя вясна і лета 1919 года і спробы наладзіць новае жыццё ва ўмовах ужо новай, польскай, улады.***

Васіль ГЕРАСІМЧЫК,
гісторык,
в. Васілевічы
Слонімскага раёна



Слонім, дом па вул. В. Крайняга, 18

# Мястэчкі Магілёўшчыны

**У сакавіку 2005 г. у Краснаполлі ўпершыню сабраліся ініцыятары руху краязнаўцаў малых мястэчак Магілёўшчыны. Ідэя аб'яднання краязнаўцаў, якія жывуць у малых мястэчках і вёсках Магілёўшчыны, узнікла каля трох гадоў таму.**



Мястэчка Глуск

Дзякуючы стараннем і імпэту вядомага ў Беларусі краязнаўцы Леаніда Лабаноўскага гэтая ініцыятыва ўвасобілася ў фармат чытанняў, што адбыліся на радзіме Леаніда Васільевіча – у Краснаполлі. Сёння побач з намі ўжо няма гэтага чалавека, які сваім жыццём і дзейнасцю з'яўляўся прыкладам самаадданай працы па вывучэнні роднага краю. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння Асацыяцыі краязнаўцаў малых мястэчак Магілёўшчыны і стаў першым старшынёй рады гэтай грамадскай ініцыятывы. Такім чынам, намаганні рэгіянальных краязнаўцаў мелі добры вынік – правядзенне краязнаўчай канферэнцыі і выданне зборніка яе матэрыялаў. Будзем спадзявацца, што такія творчыя сустрэчы краязнаўцаў стануць добрай традыцыяй.

А сёння ёсць падстава выказацца пра амаль забытыя населеныя пункты вобласці – мястэчкі.



Краявід мястэчка Бялынічы

У верасні 1938 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР выдаў указ «Аб класіфікацыі населеных пунктаў БССР». Згодна з гэтым дакументам у Беларусі ліквідаваліся мястэчкі. Беларускія местачкоўцы раніцай 28 верасня 1938 г. прачналіся хто гараджанамі, а хто проста вяскоўцамі...

Сённяшняму пакаленню беларусаў, тым, каму давялося нарадзіцца ў другой палове мінулага стагоддзя, слова «мястэчка», напэўна, нічога не скажа. Але ў людзей сталага веку гэтая назва будзіць тужлівыя і светлыя ўспаміны. Найлепш іх выказаў вядомы беларускі паэт, карэнны местачковец Сяргей Грахоўскі:

*«Сярод мноства страт знікла дарагое мне слова мястэчка, страціла свой непаўторны, вякамі складзены побыт, шчырыя адносіны сумлення і даверу, яскравы каларыт мудрых і прыгожых традыцый.*

*Што такое мястэчка?*

*Дакладнае і ёмістае слова замянілі калекамі абрэвіятур "гарпасёлак", ПГТ (пасёлак гарадскога тыпу), а найчасцей – "райцэнтр", з поўным наборам "раёў" – райкам, райвыканкам, райваенкам, райаддзелы, райканторы, райупраўленні, райзагі, райбальніцы, райміліцыі (які там рай?).*

*Гэты "рай", што ўжо не вёска і яшчэ не горад, спрадвеку звалі мястэчкам. І адразу ўзнікала ўяўленне пра ціхае, невялічкае, часта далёкае ад чыгункі паселішча з дзвюма-трыма брукаванымі вуліцамі, з вялікаю рыначнаю плошчаю пасярэдзіне, з доўгім шэрагам крам і крамак, з шумнымі асеннімі кірмашамі, з адною або дзвюма цэрквамі, некалькімі сінагогамі...*

*Усе местачкоўцы ведалі адзін аднаго, памяталі бацькоў і дзядоў, былі ў блізкім ці далёкім сваяцтве...*

*Кожнае мястэчка жыло сваімі непаўторнымі традыцыямі, сваім укладам, сваімі кепікамі, нязлоснымі байкамі пра дзівакаватыя ўчынкі, а ў кожнага местачкоўца была дасціпная мянушка, і яна пераходзіла з пакалення ў пакаленне. Не існавала тады ніякіх анкет, ніхто ні на каго не пісаў характарыстыкі. Яны былі вусныя і безапеляцыйныя – сумленны чалавек або тандэтнік* (бракароб. – **М.Д.**) *і паскуднік. Часам вярнуць добрую рэпутацыю і жыцця не хапала...».*

Так пісаў С. Грахоўскі, які ў раннім дзяцінстве разам з бацькамі пераехаў з украінскага мястэчка ў Глуск – мястэчка Бабруйскага павета, і сам зведаў той своеасаблівы «каларыт мудрых і прыгожых традыцый». На жаль, адрадзіць гэты местачковы дух сёння, відаць, ужо немагчыма.

Што ж уяўлялі сабой нашыя мястэчкі ў мінулым?

Ад горада мястэчка адрознівалася меншай колькасцю насельніцтва, адсутнасцю абарончых збудаванняў, аграрнымі рысамі гаспадаркі. У мястэчках шырока развітымі былі рамяство і гандаль. Гэта адрознівала іх ад сёлаў і вёсак.

Большасць беларускіх мястэчак узнікла ў XVI – пачатку XVII ст. як цэнтры мясцовага рамяства і гандлю. Калі ў XVI ст. іх у Беларусі налічвалася каля 300, то ў канцы XIX ст. у нашым краі было 464 мястэчкі, дзе жылі каля сямісот тысячаў чалавек – прыкладна столькі ж, колькі ў гарадах, або амаль дзясятая частка ад усяго насельніцтва.

Як вядома, асноўнымі насельнікамі мястэчак былі рамеснікі і гандляры, таму найбольш адметнай рысаю жыцця ўсялякага тагачаснага мястэчка былі рэгулярныя таргі, якія праводзіліся адзін-два разы на тыдзень.

Неад'емнай прыналежнасцю мястэчак былі заезныя двары і корчмы. Мястэчкі найчасцей знаходзіліся на шляхах зносінаў паміж гарадамі і іншымі рэгіёнамі. Да таго ж, у мястэчках праходзілі рэгулярныя кірмашы. Усё гэта спрыяльна адбівалася на развіцці рамёстваў ды промыслаў.

Значную частку насельніцтва беларускіх мястэчак складалі яўрэі. Яны займаліся рамяством, гандлем, возніцтвам, трымалі шынкі, корчмы, пастаялыя двары, вялі гандлёвыя справы памешчыкаў.

У канцы XVIII ст. царскі ўрад забараніў яўрэям пастаяннае пражыванне ў Расіі. Для іх Кацярына II вызначыла «мяжу яўрэйскай аседласці», да якой адышлі беларускія губерні, у тым ліку і Магілёўская. Але і тут яўрэям забаранялася жыць за межамі гарадоў і мястэчак.

З гэтага часу яны і сталі пераважаць сярод местачковых насельнікаў і занялі пануючае месца ў гандлі і рамястве. У некаторых мястэчках яўрэі складалі больш за палову насельніцтва. М. Без-Карніловіч у кнізе «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии» (1855) адзначае, што Шклоў, напрыклад, «смела можна назваць яўрэйскім мястэчкам». У Чэрыкаве «яўрэяў мужчынскага полу 570 душ», у Крычаве іх – 710 душ, у Бялынічах – больш за 630, а ў Краснаполлі – нават больш за 1 000 душ.

Падсумоўваючы свае падлікі, М. Без-Карніловіч называе яўрэяў «пануючым насельніцтвам» ва ўсіх мястэчках Беларусі (да Беларусі гісторык адносіў толькі Магілёўскую і Віцебскую губерні). Ён жа дае яўрэям і даволі ёмістую і трапную характарыстыку, якая і сёння выклікае інтарэс: *«Прадпрымальныя, цікаўныя, пранклівыя. З першага позірку, з першых слоў разумеюць, з кім маюць справу. Каб дасягнуць пажаданага, лічаць дазволенымі ўсе сродкі: прыніжаюцца, ліслівяць, просяць, падкупляюць, і рэдка не дасягаюць поспеху ў сваіх намерах. Наперад разлічваюць барышы, якія можа прынесці распачатая аперацыя; падлічаць расходы і толькі тады возьмуцца за справу. На Беларусі ўвесь гандаль у іх руках... Для іх ніякая праца не цяжкая, калі толькі ад яе прадбачаць для сябе карысць... Яўрэі – народ, які глыбока ведае схільнасці і звычкі людзей і ўмее карыстацца іх слабасцямі. Пазбягаюць утомнай працы: паміж імі знойдзецца многа краўцоў, шаўцоў, шапачнікаў, шкляроў, лудзільшчыкаў, бляхароў, разношчыкаў, разбяроў пячатак, залатых і сярэбраных спраў майстроў; рэдка сустрэнецца каваля, цесляра, пільшчыка...».*

З некаторымі высновамі М. Без-Карніловіча можна не пагадзіцца, але многае ім падмечана вельмі дакладна.

Пасля вайны ў былых мястэчках яўрэйскае насельніцтва значна скарацілася. А са знікненнем яўрэяў мястэчкі страцілі свой адметны каларыт, тую своеасаблівасць, што стагоддзямі вызначала гэтыя паселішчы.

Ва Усходняй Беларусі, а г.зн. і ў Магілёўскай губерні, мястэчкі размяшчаліся даволі рэдка. Але густой сетка мястэчак была ў раёнах традыцыйных рамёстваў і промыслаў – Дрыбін, Чэрняўка, Сухары, Расна.

Важнай і, відаць, адзінай крыніцай, што дае нам звесткі аб мястэчках Магілёўшчыны ў XIX ст., з'яўляецца «Вопыт апісання Магілёўскай губерні...» А. Дзембавецкага. У другой кнізе змешчаны раздзел, прысвечаны гісторыі і тагачаснаму становішчу гарадоў і мястэчак. Сярод іншых тут называюцца 43 мястэчкі Магілёўскай губерні, якія і зараз знаходзяцца на тэрыторыі вобласці. Дзесяць з іх сёння з'яўляюцца раённымі цэнтрамі. Гэта Крычаў, Касцюковічы, Хоцімск, Дрыбін, Прапойск (Слаўгарад), Шклоў, Глуск, Краснаполле, Круглае, Бялынічы. Адны маюць статус горада, іншыя – гарадскія пасёлкі. Астатнія былыя мястэчкі Магілёўшчыны на сёння, сапраўды, малыя мястэчкі, якія амаль ужо не захавалі той самабытнасці, што стагоддзямі існавала тут.

Кожнае мястэчка, як і чалавек, мае свой лёс, сваё паходжанне, сваю гісторыю. На жаль, адрадзіць сёння местачковы дух, традыцыі і побыт ужо, бадай што, немагчыма: на тое ёсць і аб'ектыўныя, і суб'ектыўныя прычыны. Але яны – нашая гісторыя. І трэба сёння захаваць сваю гістарычную спадчыну, распачаць усебаковае вывучэнне мястэчак – паселішчаў, што дайшлі да нас з часоў сярэднявечча.

*Міхаіл ДУКТАЎ*

*(Паводле «Клімавіцкіх краязнаўчых чытанняў», 2006)*

# Фонд Алеся Бачылы

***Алесь Бачыла (1918 – 1983) – яркае імя ў беларускай паэзіі. Нарадзіўся на Пухавіччыне ў маляўнічай вёсачцы Лешніца. Першая яго кніга «Шляхі» пабачыла свет у 1946 годзе. Друкаваўся Алесь Мікалаевіч не шмат, але ва ўсе гады імкнуўся працаваць роўна (у некаторай ступені выключэннем з'яўляюцца 1955, 1958, 1964, 1965 гады). У 1955 годзе яго верш пра Янку Купалу быў змешчаны ў калектыўным зборніку і адзін верш у «Чырвонай змене». У 1964 – публікацыя па-беларуску «Юнацкі свет Валодзі Ульянава» ў «Літаратуры і мастацтве».***

***І ўсё ж паэт працаваў даволі інтэнсіўна: сведчанне гэтаму – яго архіў, значная частка якога захоўваецца ў Пухавіцкім краязнаўчым музеі. Цэнтр гэтай асветніцкай установы знаходзіцца ў вёсцы, непадалёк Мар'інай Горкі. У раённым жа цэнтры – карцінная галерэя музея, фонды ўстановы і літаратурны пакой Алеся Бачылы (з кнігамі з яго хатняй бібліятэкі і прадметамі мастацтва). Усе матэрыялы старанна захоўвала жонка Алеся Мікалаевіча Яўгенія Яфрэмаўна (іх перадаў у музей сын паэта Барыс Бачыла на пачатку 2000-х). Варта заўважыць, што гэты працэс суправаджаўся шэрагам мерапрыемстваў, якія ў знак памяці паэта-земляка арганізавалі Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей і Пухавіцкая раённая бібліятэка.***

У фондах захоўваюцца шматлікія ксеракапіяваныя матэрыялы (дакументы А. Бачылы перадаваліся ў іншыя ўстановы, напрыклад, у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны). Але ўсё ж пухавіцкі збор не можа не ўражваць. Гэта і багатая калекцыя фотаздымкаў (некаторыя з іх вядомыя па публікацыях у кнігах паэта, у пасмяротным трохтомным зборы твораў, але большасць з'яўляюцца арыгінальнымі). Арыгінальныя і здымкі 1940 – 1950 гадоў, асабліва частка фатаграфічнага збору часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Асобнае месца займаюць творы А. Бачылы. Гэта падборка вершаў, рукапіс вершаў да зборніка «Белы бярэзнік» (з праўкамі аўтара), які з'яўляецца адной з яркіх кніг. Захоўваюцца ў архіве раённага музея лібрэта да оперы «Калючая ружа» А. Бачылы, праграма да яе, рукапіс твора, афіша рэпертуару тэатра оперы і балета на сезон 1961/1962, іншыя матэрыялы, што сведчаць пра творчыя зацікаўленні паэта ў тэатральным накірунку.

Значную частку архіва складаюць эпісталярныя дакументы. Ёсць лісты рускага паэта Канстанціна Ваншэнкіна, славутай дзяячкі беларускага асветніцтва Зоські Верас (з ёй А. Бачыла актыўна ліставаўся ў звязку з працай над кнігай «Дарогамі Максіма»). А вось што ўзгадвае Зоська Верас у адказ на мае даўнія роспыты: «Збіраючы матэрыял да сваёй кніжкі "Дарогамі Максіма", Алесь Мікалаевіч не мог не пацікавіцца маімі ўспамінамі з 1916 года, калі мы з Максімам Багдановічам на працягу 5 месяцаў спатыкаліся кожны дзень. І то не на якіх-небудзь пасяджэннях, а зусім прыватна. Ліставанннне ў такім выпадку рэч маланадзейная. Найлепшае – асабістая сустрэча…

І вось Алесь Мікалаевіч летам 1970 года прыехаў у Вільню.

Не мала меў клопату, пакуль адшукаў наш лясны домік, але неяк знайшоў.

Я спаткала яго каля брамкі на панадворку. Знаёмства завязалася хутка, і аднесліся мы адно да другога з даверам. Я з прыемнасцю падзялілася з Алесем Мікалаевічам сваімі ўспамінамі аб М. Багдановічу.

Часу да цягніка, якім Алесь Мікалаевіч ад'язджаў у Менск, заставалася шмат і А.М. захацеў паглядзець горад і могілкі "Росса", дзе пахавана нямала беларускіх паэтаў, пісьменнікаў і дзеячаў… Сын мой ахвотна згадзіўся зрабіць экскурсію па горадзе…

Яны – мой сын і Алесь Мікалаевіч – былі амаль аднагодкі і хутка пасябравалі… Пасля гэтай першай сустрэчы мы з А.М. пачалі рэгулярна карэспандаваць.

Цікавыя лісты пісаў мне А. Бачыла, дзяліўся плянамі на будучыню, прысылаў усе свае новыя кніжкі – зборнікі вершаў…

Усё гэта перахоўваю як дарагую памятку. Пару гадзін першай – і, на вялікі жаль, апошняй – сустрэчы, шчырай гутаркі назаўсёды засталіся ў памяці.

П. Войцік». (Тут захаваны правапіс Зоські Верас.).

Сярод іншых эпісталярыяў – лісты Пімена Панчанкі, Рыгора Няхая, паштоўка ад Максіма Танка.

***Повязь А. Бачылы з Пухавіччынай даволі трывалая. Сучаснікі заўважаюць кожны юбілей паэта. Адна з вуліцаў Мар'інай Горкі носіць яго імя. Замоваю землякоў выдавецтва «Літаратура і Мастацтва» выдала некалькі гадоў таму зборнік «Радзіма мая дарагая» А. Бачылы. Несумненна, развіццю літаратурна-краязнаўчай працы ў асэнсаванні спадчыны паэта і яго месца ў гісторыі Пухавіччыны і беларускай літаратуры якраз і будзе спрыяць наяўнасць архіва творцы ў Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі, магчымасць карыстацца ўнікальнымі, цікавымі дакументамі. Што само па сабе з'яўляецца добрым прыкладам для іншых.***

*Алесь КАРЛЮКЕВІЧ*

# Лёс мастака пад акупацыяй

***Уладзімір Хрусталёў (1896 – 1954) належаў да найстарэйшага пакалення вядомых беларускіх мастакоў. Некаторыя яго працы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і шырока вядомыя. Гэта найперш «Канстанцін Заслонаў» (1950), «Канцэрт лесасплаўшчыкаў на Дзвіне» (1940), «Вяртанне партызан з аперацыі» (1945), «Від Віцебска» (1927), «У пошуках маці» (1947), «Зіма» (1952), «Вясна» (1936) і інш.***

На Віцебшчыне вучань Б. Кустодзіева з'явіўся ў 1919 годзе – адразу пасля заканчэння Акадэміі мастацтваў у Петраградзе. У горадзе Веліжы, які адносіўся тады да Віцебскай губерні, ён пачаў выкладчыцкую дзейнасць у мастацкай школе. У 1926 годзе У. Хрусталёў пераехаў у Віцебск і пачаў выкладаць у мясцовым мастацкім тэхнікуме. Сярод яго вучняў было нямала добра вядомых у рэспубліцы мастакоў. З 1947 года і да заўчаснай смерці Уладзімір Якаўлевіч выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы. А паміж гэтымі падзеямі была Вялікая Айчынная вайна, якую мастак перажыў у акупаваным Віцебску.

Гэта была «цёмная» пляма ў яго біяграфіі, бо да ўсіх, хто апынуўся на акупаванай ворагам тэрыторыі, у пасляваенны час было вельмі насцярожанае стаўленне. Хто ведае, можа быць менавіта гэта і прывяло да таго, што таленавіты мастак і дасведчаны педагог пайшоў з жыцця так рана: усяго ў 57 гадоў.

Нядаўна мне ўдалося выявіць дакументы, што расказваюць менавіта пра гэты перыяд жыцця У. Хрусталёва. Гэта яго асабістая справа, якая захоўваецца ў фондзе гарадской управы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Адносіцца яна да 1943 года.

Апынуўшыся ў акупаваным фашыстамі Віцебску, мастак вымушаны быў думаць пра хлеб надзённы не толькі для сябе, але і для двух сваіх малалетніх дзяцей: на пачатку вайны дачцэ было 3 гады, сыну – 5. Утрох яны жылі ў кватэры № 9 дома № 29 на Траецкай вуліцы (цяпер – Куйбышава). Таксама некаторы час Хрусталёў жыў у доме з сучасным адрасам вул. Суворава 7/8.

Уладзімір Якаўлевіч заняўся тым, што ён умеў рабіць і што было яго прафесіяй. Каб пазбегнуць якіх-небудзь абвінавачванняў у лаяльнасці да новых уладаў, ён пісаў толькі партрэты і пейзажы. Праўда, як ён адказваў на пытанне аб кантынгенце абслугоўвання, былі гэта ў асноўным «немцы, рэдка насельніцтва горада».

Вельмі малая колькасць дакументаў «Асабістай справы» не дазваляе дастаткова поўна апісаць жыццё мастака У. Хрусталёва ў акупаваным Віцебску. Пра сёе-тое даводзіцца меркаваць гіпатэтычна. Напрыклад, пра тое, што напісаннем партрэтаў і пейзажаў ён займаўся з лета 1941 года, не маючы на гэта спецыяльнага дазволу (патэнта). Высветлілася гэта 24 сакавіка 1943 года, калі фінансавы інспектар гарадской управы рабіў абыход жыхароў свайго ўчастка і «выявіў мастака за працай – зімовым пейзажам». Праз тры тыдні, 15 красавіка, акт аб гэтым склаў памочнік інспектара. У ім паведамляецца, што У. Хрусталёў «займаецца ў сябе дома мастацкай работай без патэнта і рамеснай карткі».



*«Канстанцін Заслонаў»*

Падобнае парушэнне правілаў пагражала даволі суровым пакараннем, у лепшым выпадку штрафам… Але мастака нават не аштрафавалі. Відаць, паўплывала тое, што ён «усё гэта робіць для нямецкай часці на аэрадроме, там, дзе і працуе». У. Хрусталёву тэрмінова, у той жа дзень, афармляюць патэнт, за што ён выплачвае пошліну ў памеры 100 рублёў.

Далей у «Справе» прыводзіцца некаторая інфармацыя, што патрабуецца для фінансавага кантролю. У. Хрусталёва прымушаюць заплаціць падатак за ўвесь перыяд, які ён займаўся «мастацкімі работамі», гэта значыць з пачатку 1943 года, хоць, пэўна, ён гэтым займаўся і значна раней. Але ў фінансавых работнікаў няма ніякіх доказаў, а сам мастак у гэтым не прызнаецца. Таму падатак аплачваецца толькі з пачатку 1943 года.

За першы квартал жывапісец дэкларуе абарачэнне ў памеры 3 070 рублёў, чысты прыбытак – у 2 100 рублёў. А вось ужо за другі квартал даецца больш поўная справаздача. Па-першае, У. Хрусталёў паведамляе час, неабходны для выканання работ: на партрэт памерам 30 х 40 см – 24 гадзіны, на партрэт памерам 50 х 30 см – 28 – 30 гадзін. Для таго, каб напісаць пейзаж памерам 50 х 30 см, яму патрабавалася 30 гадзін, на пейзаж памерам 70 х 50 см – 40 гадзін.

Па-другое, у гэтай жа справаздачы прыводзяцца звесткі і пра кошт мастацкіх работ. Партрэт памерам 30 х 40 см прадаваўся за 300 рублёў, партрэт памерам 40 х 50 см – за 350 рублёў. Столькі ж адпаведна каштавалі пейзажы памерам 50 х 30 см і памерам 70 х 50 см. Мастак паведамляе, што арэнда памяшкання (гэта значыць яго жыллё) яму абыходзіцца ў 45 рублёў, а матэрыялы, неабходныя для працы, ён набывае на рынку. Валавы даход за 2-і квартал склаў 5 745 рублёў, а чысты – 2 585,5 рублёў.

Мяркуючы па тым, што «Справа» У. Хрусталёва скончаная летам 1943 года, і справаздачы за 3-і квартал у ёй ужо няма, мастак восенню таго ж года сам з'ехаў з Віцебска ці быў вывезены немцамі. Пацвярджаецца гэта яшчэ і тым, што ў Мінску ён з'явіўся толькі ў 1947 годзе. Мабыць, праходзіў нейкі час праверку пасля вяртання на радзіму. А паколькі мастаку дазволілі педагагічную дзейнасць у Мінскім мастацкім вучылішчы, відаць, ніякіх матэрыялаў, якія б кампраметавалі яго, выяўлена не было. Прыклад У. Хрусталёва толькі пацвярджае агульнавядомы факт: хто не хацеў супрацоўнічаць з акупантамі, цалкам мог без гэтага абысціся і выжыць.

*Аркадзь ПАДЛІПСКІ,*
*журналіст, гісторык-краязнаўца*

*Артыкул апублікаваны ў серыі праекта «Віцебск: папулярнае мінулае»*

## Жнівень

**1 – Першая сусветная вайна** (1914 – 1918), вайна паміж Цэнтральнымі дзяржавамі (Германія, Аўстра-Венгрыя, Турцыя, Балгарыя) і краінамі Антанты (Расія, Францыя, Вялікабрытанія, Сербія, пазней Японія, Італія, Румынія, ЗША і інш.) – 100 гадоў з часу абвяшчэння Германіяй вайны Расіі.

**2 – Віцінг (Віцінгс) Яўген Эдуардавіч** (1884 – 1959), оперны спявак, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі і Латвіі – 130 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Каламійцава Таццяна Міхайлаўна** (1914 – 1994), беларускі дырыжор, народная артыстка Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Радзівіл Мікалай Крыштоф** (мянушка Сіротка; 1549 – 1616), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, мецэнат, пісьменнік – 465 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Рудэнка Іван Пятровіч** (1939), спявак, заслужаны артыст Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Жураўскі Аркадзь Іосіфавіч** (1924, Талачынскі р-н – 2009), мовазнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Багданаў Мікалай Аляксандравіч** (1944, Краснапольскі р-н), спявак, заслужаны артыст Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Хлябцэвіч Яўген Іванавіч** (1884, Слонімскі р-н – 1953), бібліятэказнаўца, кнігазнаўца, бібліёграф, літаратуразнаўца, дзеяч беларускага культурна-грамадскага руху пачатку XX ст. – 130 гадоў з дня нараджэння.

**7 – Кухаронак Таццяна Іванаўна** (1954, Чэрвеньскі р-н), вучоны-этнограф, гісторык, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2008) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**7 – Трусаў Алег Анатольевіч** (1954, Мсціслаў), вучоны-археолаг, гісторык архітэктуры, грамадскі дзеяч – 60 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Смалянскі Аляксандр Аляксандравіч** (1934 – 1998), харэограф, педагог, заслужаны артыст Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Гарбунова Людміла Васільеўна** (1939), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Мсціслаў** (XII ст.), горад у Магілёўскай вобласці, цэнтр раёна – 380 гадоў з часу атрымання граматы на магдэбургскае права (1634).

**16 – Уласаў Аляксандр Мікітавіч** (1874, Вілейка – 1941), беларускі выдавец, грамадска-палітычны і культурны дзеяч, публіцыст, мемуарыст – 140 гадоў з дня нараджэння.

**Пятро ГЛЕБКА**

### Рыбак

*Як толькі выходны дзянёк настае,*
*Ён вуды і снасці збірае свае,*
*І досвіткам раннім на бераг ідзе,*
*І ціха спускаецца к цёмнай вадзе.*

*Стаіўшыся ў дзікім густым лазняку,*
*Ён вуды свае закідае ў раку.*
*А там, адліваючы срэбнай луской,*
*Бліскучыя рыбы ідуць чарадой.*

*Напяўшы тугія свае плаўнікі,*
*Хвастамі ад прагнасці б'юць шчупакі.*
*Шырокія плоткі з чырвоным пяром*
*Снуюць над празрыстым, прасвечаным дном.*

*У змроку у іле ляжаць карасі,*
*У зеллі багністым жыруюць язі,*
*У ціне лянівыя ходзяць ліні,*
*А ў тонях пярэстыя спяць акуні.*

*Мільёны вялікіх і дробненькіх рыб*
*Наверх усплываюць, ныраюць углыб,*
*Гуляюць на хвалях, жыруюць на дне,*
*А вось за кручок ні адна не кране.*

*І раптам, схіліўшыся трошкі набок,*
*Схіснуўся і знік пад вадой паплавок,*
*Вудзільна сагнулася ў спрытнай руцэ,*
*А хвалі кругамі пайшлі па рацэ.*

*І вось праз секунду, а можа, праз дзве*
*Трапечацца лешч на вільготнай траве.*
*На шчасце закінуўшы вуду ізноў,*
*Рыбак аглядае свой першы улоў.*

**Вера ВЯРБА**

* * *

*Схіляецца ніва да самай зямлі,*
*У кветках паснулі ад спёкі чмялі,*

*На лапах замшэлых калышацца бор,*
*І пахам дурманіць духмяны чабор.*

*Як добра стаміцца ад цяжкіх дарог,*
*Схіліцца ў знямозе пад елку на мох*

*І слухаць так прагна, і соладка сніць,*
*Як срэбны жаўрук над палямі звініць.*

*Хвалюецца жыта у спелай красе,*
*Чмель з вусаў пылок асцярожна трасе...*

*Зямля залатая з цяжарам палёў*
*І з пошумам рэчак і цёмных бароў,*
*Паслухай маленькага сэрца любоў!*



### Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 27

**Уздоўж:** **5.** Тачыла. **6.** Суркоў **7.** Вясна. **9.** Стала. **11.** Наказ. **13.** Куніцкі. **16.** Раман. **18.** Народ. **19.** Аліна. **20.** Забыты. **21.** Памяць.

**Упоперак**: **1.** «Палата». **2.** Слава. **3.** Туман. **4.** Волкаў. **8.** Савіцкі. **10.** Лукша. **12.** Азіна. **14.** Салдат. **15.** Полацк. **17.** Наста. **18.** Назад.

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**НА́ДПІС** – лірычны верш, які ў форме надпісу на партрэце, статуі, кнізе, камені і г.д. афарыстычна выяўляе нейкую думку, стаўленне аўтара да пэўнай асобы ці падзеі. Такія вершы пісалі М. Ламаносаў, А. Пушкін, Ф. Шылер і інш. У савецкай паэзіі гэты жанр найбольш плённа распрацоўваў Р. Гамзатаў (цыкл «Надпісы»). Да надпісаў часам звяртаюцца беларускія паэты, напр., «Надпіс на камені» Максіма Танка:

*Мы, пахаваныя на зямлі,*
*Вечна будзем зайздросціць тым,*
*Што – на зорах.*
*Няўжо і яны таксама*
*Будуць зайздросціць зямлянам?*

Да месца тут прыгадаць і надпіс даравальны (дарчы надпіс), што пакідае аўтар на сваім творы.

**НАЗВА́НЫЯ БАЦЬКІ́** – дзейныя асобы ў сацыялістычным абрадзе ўрачыстай рэгістрацыі нованароджаных, які бытаваў у СССР. Называюцца таксама ганаровыя бацькі, нарачоныя бацькі. Вядомыя з 1970-х гг. Названыя бацькі – блізкія сябры сям'і нованароджанага. Прымаюць удзел у выхаванні свайго названага сына або дачкі. У час рэгістрацыі нованароджанага названым бацькам уручалася «Пасведчанне-памятка».

Абрад быў распрацаваны і ўкараняўся дзеля замены хрышчэння і замены паняцця «хросныя бацькі».

**НАЗЕ́МНАЕ ЖЫТЛО́** – агульнапрынятая ў археалогіі назва старажытнай жылой пабудовы, што ставілася непасрэдна на паверхні зямлі. Узніклі ў эпоху палеаліту і ўяўлялі сабой лёгкія часовыя жытлы, што засцерагалі ад непагадзі. У познім палеаліце і мезаліце побач з паўзямлянкавымі жытламі існавалі круглыя або авальныя ў плане наземныя жытлы тыпу чумаў з агнішчамі ўнутры. У неаліце пашырыліся круглыя або авальныя (у канцы неаліту прамавугольныя) у плане жытлы слупавой канструкцыі плошчаю 12 – 15 м² з агменямі ў выглядзе каменнай вымасткі, часам абкладзенай па краях буйнымі камянямі або заглыбленай у зямлю на 0,1 – 0,2 м. Перакрыцце абапіралася на слуп, што размяшчаўся ў цэнтры жытла. У бронзавым веку існавалі прамавугольныя ў плане наземныя жытлы слупавой канструкцыі з адкрытымі агнішчамі і 2-схільнымі перакрыццямі. У раннім жалезным веку пашырыліся больш складаныя і разнастайныя па архітэктурных асаблівасцях жытлы, што існавалі побач з паўзямлянкамі. Для плямёнаў мілаградскай культуры і зарубінецкай культуры характэрныя аднакамерныя квадратныя або прамавугольныя ў плане будынкі слупавой канструкцыі плошчаю ад 10 да 20 – 24 м². Характэрная асаблівасць мілаградскіх жытлаў – наяўнасць выступу прамавугольнай, круглай ці авальнай формы ў адной са сценаў або вуглоў. Агнішчы часам заглыбляліся ў зямлю на 0,1 – 0,5 м. 2-схільныя стрэхі абапіраліся на цэнтральны і дадатковыя слупы, што размяшчаліся на адной лініі. Наземныя жытлы плямёнаў культуры штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай культуры былі адналькавыя і ўяўлялі сабой доўгія дамы слупавой канструкцыі з бярвёнаў таўшчынёй 0,25 – 0,3 м, падзеленыя на некалькі (ад 2 да 5) жылых памяшканняў плошчаю ад 10 – 15 да 20 – 25 м². Унутры памяшканняў былі агнішчы круглай, авальнай або падковападобнай формы з пласта пяску 0,1 – 0,15 м, абкладзенага камянямі ці валікам гліны (дыяметр круглых агнішчаў 1,1 – 1,5 м, даўжыня авальных 1,5 – 1,8 м, шырыня 0,8 – 1,3 м). У IV – V стст. з'явіліся аднакамерныя жытлы, разлічаныя на малую сям'ю. У плямёнаў культуры тыпу Банцараўшчыны існавалі наземныя і паўзямлянкавыя жытлы. Большасць наземных жытлаў плошчаю 10 – 15 м² мелі чатырохвугольную форму, слупавую і зрубную канструкцыю. Агмені ў выглядзе каменнай вымасткі, абмазанай глінай, таўшчынёй 0,1 – 0,12 м, круглай (дыяметрам 1,7 м) або авальнай (даўжыня 2,4 м, шырыня 2,1 м) формы размяшчаліся пасярэдзіне жытла, часам трапляліся печы-каменкі. Перакрыцці 2-схільныя.

Для эпохі Старажытнай Русі характэрныя надземныя жытлы з бярвёнаў, аднакаморныя з 2-схільнай страхой. Унутры, у адным з кутоў, на драўляных насцілах («апечках») размяшчаліся глінабітныя печы без комінаў. У жытлах сельскіх пасяленцаў былі печы-каменкі. На аснове старажытнага надземнага жытла развіліся разнастайныя тыпы і формы беларускага народнага жылля.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасны – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 31.07.2014
Газета надрукавана ўдрукарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 644.
Тыраж 920 асобнікаў.